На жаль, сусветная супольнасць не адмовілася ад тэрарызму, узброеных канфліктаў, рэвалюцый і войнаў. Наадварот, сёння ў розных частках свету новыя палітідэолагі і паліттэхнолагі актыўна навязваюць ідэі так званых «каляровых рэвалюцый». Гісторыя пераканаўча сведчыць, што ідэі палітычных абнаўленцаў не здольны пазбавіць людзей ад праблем. Яны толькі перарываюць, адкідваюць назад аб'ектыўны працэс развіцця грамадства і памнажаюць трагедыі народаў.

Сёння архіактуальнай задачай з'яўляецца процістаянне экстрэмізму ва ўсіх яго праявах. Неабходна актыўна распаўсюджваць ідэі дабра, братэрства, справядлівасці ў грамадскай свядомасці, асабліва ў асяроддзі падрастаючага пакалення, каб пазбавіць экстрэмізм сацыяльнай падтрымкі.

**Шаноўныя калегі!**

Упэўнены, што выказаныя на нашым форуме ацэнкі і ідэі накіраваны ў будучыню развіцця беларускага грамадства. Вядома, што дакладнасць прадбачання вызначаецца перш за ўсё тым, наколькі глыбока і ўсебакова мы вывучаем мінулы вопыт, сучасны стан і заканамернасці змены грамадскага развіцця. Без засваення гэтых фундаментальных пастулатаў у іх адзінстве, без іх практычнага выкарыстання немагчыма не толькі навуковае прадбачанне, але і будучыня развіцця грамадства.

Перакананы, што толькі прыгажосць, дабрыня і закон здольны выратаваць цывілізацыю ад пагружэння ў бяздзейнасць, заганы і разбурэнне. Любіце і рабіце дабро адзін аднаму!

Дзякуй за увагу!

### Бібліяграфічны спіс


1. Декреты Советской власти / Институт марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Институт истории Академии наук СССР. — М.: Госполитиздат, 1957.
2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах: са старажыт. часоў да нашых дзён / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. — [2-е выд., дап.]. — Мінск: Акад. МУС, 2003. — 320 с.
3. Советская Правда. 21 дек. 1917.
4. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч і інш. — Выд. 2-е, дапоўненае. — Мінск, 2005. — 432, [6] с.
5. Святое Дабравесце паводле Матфея, 12: 25 // Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста. — Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, Медыял, 2017. — 542, [1] с., [1] л. іл.



**Брыгадзін Пётр Іванавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*


## ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД: ЧАС І АСОБЫ

Лютаўская рэвалюцыя абудзіла нацыянальна-вызваленчы рух на прасторах Расійскай імперыі. Часовы ўрад аб'явіў аб роўнасці грамадзян незалежна ад іх саслоўнай, рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасці. Скасоўваліся абмежаванні адносна месцаў пражывання, паступлення на дзяржаўную вайсковую службу, у навучальныя ўстановы. Была пацверджана аўтаномія Фінляндыі, выказана прапанова аднаўлення незалежнасці Польшчы.Адносна

другіх нацыянальных тэрыторый, то Часовы ўрад адносіў гэтыя праблемы да Устаноўчага сходу. Тым не менш, украінскія, беларускія, літоўскія нацыянальныя арганізацыі выступілі з праектамі дзяржаўнага ўладкавання.

Беларусь у гэты час была падзелена на часткі і з'яўлялася франтавой і прыфрантавой тэрыторыяй. У грамадстве ўсё больш нарасталі эканамічныя праблемы і адначасова назіралася эйфарыя ў грамадскім жыцці. З сакавіка па лістапад 1917 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 26 палітычных партый і арганізацый.

25 сакавіка па ініцыятыве старшыні мінскай арганізацыі БСГ А. Смоліча адбыўся з'езд беларускіх палітычных партый і арганізацый, на якім прысутнічала каля 150 чалавек: прадстаўнікі БСГ, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, Беларускай партыі народных сацыялістаў, саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт у складзе 18 чалавек для падрыхтоўкі выбараў у Беларускую краёвую раду.У склад БНК увайшлі: Раман Скірмунт (старшыня), Павел Аляксюк — намеснік старшыні, Усевалад Фальскі — намеснік старшыні, Браніслаў Тарашкевіч — сакратар, Леанард Заяц — скарбнік, Аркадзь Смоліч, ксёндз Эдвард Будзька, Алесь Бурбіс, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, Бабарыкін, Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец), Міхаіл Кахановіч, Яўсей Канчар, Іван Краскоўскі, Вацлаў Іваноўскі, Лявон Дубейкаўскі, Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны), Фабіян Шантар.

Прэзідыум БНК: Р. Скірмунт, П. Аляксюк, У Фальскі, Л. Заяц, Б. Тарашкевіч [1, с. 25]. Беларуская дэлегацыя на чале з Р. Скірмунтам была накіравана на перагаворы з Часовым урадам. Упершыню міністру-старшыні Часовага ўрада Г. Львову накіравана запіска аб неабходнасці аўтаноміі для Беларусі, пашырэнні мясцовага самакіравання.

Беларускі нацыянальны камітэт пазней у ліпені будзе рэарганізаваны ў Цэнтральную раду беларускіх арганізацый, якая аб'яднала 23 арганізацыі. У кастрычніку 1917 г. Рада атрымала назву Вялікая беларуская Рада.

Актыўныя дзеячы нацыянальнага руху добра разумелі неабходнасць падтрымкі з боку вайскоўцаў, сялянства. У пачатку красавіка Белнацкам праводзіць краявы сялянскі з'езд, у маі спрабуе арганізаваць беларускае войска.

Для актывізацыі гэтай работы ў кастрычніку (18—24) з'езд дэлегатаў Заходняга фронту пры ўдзеле прадстаўнікоў Балтыйскага флоту, Румынскага і Паўночнага франтоў ствараюць Цэнтральную Беларускую вайсковую Раду. Яе выканкам узначаліў С. Рак-Міхайлоўскі. У склад кіраўніцтва Рады ўвайшоў генерал ад інфантэрыі Кіпрыян Кандратовіч, які распрацаваў план фарміравання беларускага войска. У кастрычніку дэлегацыя ЦБВР (С. Рак-Міхайлоўскі, К. Кандратовіч, Н. Ярушэвіч, І. Шчэрба) правяла перагаворы ў Стаўцы Галоўнакамандуючага Н. Духоніна аб арганізацыі беларускіх вайсковых злучэнняў.

Самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Усебеларускага з'езда прыняў Беларускі абласны камітэт (БАК), які быў створаны 17 лістапада пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў з ліку дэлегатаў ад беларускіх губерній, прадстаўнікоў арміі і флоту (Я. Канчар, М. Гольман, Ф. Караткевіч, А. Кюсэ-Цюз, Е. Макарэвіч, В. Селіванаў, Л. Калядка). БАК заявіў аб намеры «ўзяць на сябе пачын склікання надзвычайнага беларускага з'езда» [1, с. 52]. БАК павёў перагаворы з кіраўніцтвам Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей Савецкай Расіі адносна нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва.

26 лістапада 1917 г. створаны орган савецкай улады на тэрыторыі Заходняй вобласці і фронту — Аблвыкамзах (старшыня — А. Мяснікоў). Са 170 членаў Аблвыкамзаха больш за 100 чалавек з'яўляліся ваеннаслужачымі. Беларусаў у гэтым органе ўлады было ўсяго 3 чалавекі: левыя эсэры Казлоў, Дайнека і Муха [3, с. 62].

Рашэнне аб скліканні з'езда было прынята ВБР, БАК, ЦБВР, Беларускім выканаўчым камітэтам Заходняга фронту 24 лістапада. У адозве «Да ўсяго беларускага народа» гаварылася, што:

- ўлада на Беларусі павінна належыць Краёвый радзе, абранай дэмакратычным шляхам;
- Беларусь павінна быць дэмакратычнай рэспублікай, спаянай з Вялікарасіяй і суседнімі рэспублікамі на аснове федэрацыі.
- Заклік абіраць прадстаўнікоў на Усебеларускі з'езд 5 снежня 1917 г.

5 снежня ў Мінск прыехалі каля 300 дэлегатаў з правам рашаючага голасу. Вечарам 7 снежня іх колькасць павялічылася да 383 чалавек. Было вырашана аб'явіць з'езд правамочным. Ад Бюро па скліканню з'зда выступіў С. Рак-Міхайлоўскі. «Народ беларускі. Мне выпаў высокі гонар адкрыць гэты з'езд. Паўз вашы плечы я бачу ўсю Беларусь. Яна стаіць перад вамі змучаная, поўная журботы і надзеі. Па яе схуднелым шчакам цякуць слёзы. Беларусы! Вы прыйшлі сюды сказаць сваё слова. Працуйце ж на карысць свайго народа. Няхай жыве Вольная Беларусь» [3, арк. 180].

Яшчэ 6 снежня быў абраны Савет з'езда (36 чалавек), сфарміравана 8 секцый з'езда. Пазней іх колькасць павялічылася да 14. Потым афарміліся фракцыі, групы. На працягу 5—15 снежня мандатная камісія выдала 1167 мандатаў з правам рашаючага голасу і 705 — дарадчага.

9 снежня абраны прэзідыум з'езда: С. Рак-Міхайлоўскі (старшыня), а пасля прыезду большасці дэлегатаў 14 снежня абраны новы склад прэзідыума і Савет з'езда. Старшынёй прэзідыума з'езда стаў І. Серада, намеснікамі — А. Вазіла, А. Прушынскі, сакратарамі — Л. Каляда і Шаўчук, намеснікамі сакратароў — Т. Грыб і Гушча.

Савет з'езда ў складзе 57 чалавек узначаліў Я. Варонка.

З'езд прадстаўляў тагачаснае беларускае грамадства (прадстаўнікі Саветаў (1 чал. ад павета), губернскіх, павятовых і валасных земстваў, губернскіх і павятовых самакіраванняў, губернскіх і павятовых зямельных камітэтаў, настаўніцкіх арганізацый, беларускіх нацыянальных арганізацый, дэлегаты ад арміі і флоту, тылу, члены выканаўчых камітэтаў БАК, ВБР, ЦБВР і г. д.).

У перыяд 15—17 снежня з'езд падыйшоў да вырашэння галоўнага — арганізацыі краёвай улады і самавызначэння Беларусі. Галоўным пунктам разыходжання было і стварэнне самастойнай дзяржавы ці аўтаномія ў складзе Савецкай Расіі. Але нават памяркоўнае патрабаванне самавызначэння ў форме рэспублікі ў складзе агульнарасійскай федэрацыі не мела поспеху. Як пісаў пазней А. Цвікевіч «прынцып федэрацыі мала каму быў вядомы. <...> Нязнайства федэратыўнай сістэмы было нагэтулкі вялікае, што прапанова назваць Беларусь рэспублікай, хоць бы іў складзе Расійскай федэрацыі, выклікала сярод дэпутаў абурэнне, спрэчкіі варожыя адносіны» [1, с. 61]. З'езд сведчыў аб дамінаванні сацыяльнага над нацыянальным.

Між тым, вечарам 17 снежня на нарадзе з лідэрамі фракцый і земляцтваў быў выпрацаваны тэкст пастановы аб самавызначэнні Беларусі і часовай краё-

вай уладзе. Дакумент быў зачытаны 1 гадзіну 15 хвілін у ноч на 18 снежня. Рэзалюцыя складалася з 15 пунктаў, сярод якіх цэнтральнае месца займаў першы. У ім падкрэслівалася, што «замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, абвешчанае Расійскай рэвалюцыяй, і ўсталёўваючы рэспубліканскі дэмакратычны лад у межах беларускай зямлі, для выратавання роднага краю і засцерагаючы яго ад падзелу і адарвання ад Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі, І Усебеларускі з'езд пастанаўляе: неадкладна арганізаваць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў дзелавыя зносіны з цэнтральнай уладай, адказнай перад Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў» [4, с. 105].

У рэзалюцыі адзначалася, што названы орган мясцовай улады канцэнтруе ў сабе ўсе функцыі адказнага кіравання краем, ён мусіць прыняць меры да найхутчэйшага склікання Беларускага ўстаноўчага сходу, які павінен вызначыць лёс беларускага народа. Астатнія пункты рэзалюцыі датычыліся арганізацыі беларускага войска, вырашэння зямельнага пытання, устанаўлення народнага кантролю над вытворчасцю і гандлем і інш.

Як бачна, прапанаваная рэзалюцыя мела кампрамісны характар, у ёй улічваліся інтарэсы ўсіх дэлегатаў з'езда: і «радаўцаў», і «абласнікоў». У дакуменце нават абмінута ўвагай назва Беларусі як аўтаномнай рэспублікі. Гаворка ішла пра кіраванне краем, беларускія землі, Расійскую федэрацыю і сувязь з цэнтральнай уладай.

Дэлегаты паспелі аднагалосна прыняць толькі першы пункт рэзалюцыі. У ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. з'езд быў разагнаны сілай, прычым, як сцвярджалі ўдзельнікі тых падзей, кіраваў гэтым працэсам начальнік Мінскага гарнізона Крывашэін, які ў той момант знаходзіўся ў нецвярозым стане. Былі арыштаваны 27 чалавек, у тым ліку старшыня з'езда І. Серада.

18 снежня на пасяджанні часткі прэзідыўма і савета з'езда ў памяшканні дэпо Лібава-Роменскай чыгункі было вырашана:

1. лічыць І Усебеларускі з'езд насільна разагнаным;
2. Савет з'езда прызнаць выканаўчым органам з'езда, абавязкам якога з'яўляецца прывядзенне ў жыццё ўсіх пастаноў і рашэнняў з'езда;
3. дапоўніць савет з'езда дэлегатамі ад зямляцтваў і іншых груп [4, с. 110].

21 снежня абраны Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда, які ўзначаліў Язэп Варонка. У склад камітэта ўвайшлі Палута Бадунова, Томаш Грыб, Макар Касцевіч (Макар Краўцоў), Алесь Прушынскі (Алесь Гарун), Сымон Рак-Міхайлоўскі, Іван Серада, Леанард Заяц, Язэп Дыла і Іосіф Лагун.

Факт склікання Усебеларускага з'езда, шырокае абмеркаванне праблемы нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння мела выключнае значэнне. З'езд засведчыў аб усведамленні беларускім народам сваіх палітычных інтарэсаў. Лепшыя прадстаўнікі беларускага народа заклалі першыя камяні ў фундамент беларускай дзяржавы. Таму я зноў вяртаюся да некаторых з гэтых імён, вядомых, на вялікі жаль, толькі спецыялістам-гісторыкам.

Адным з найбольш актыўных дзеячоў беларускага адраджэння, арганізатарам аб'яднання розных беларускіх палітычных груповак у першыя месяцы пасля Лютаўскай рэвалюцыі быў Раман Скірмунт. Менавіта ён узначаліў 27 сакавіка 1917 г. Беларускі нацыянальны камітэт.

Нарадзіўся Раман Мар'ян Скірмунт 25 красавіка (7 мая) 1868 г. у маёнтку Парэчча на Піншчыне. Яго бацька — адзін з найбольш вядомых

землеўладальнікаў і фабрыкантаў Мінскай губерніі. Раман Скірмунт пісаў пра сваё паходжанне: «Я сам ураджэнец беларускага Палесся, нашчадак літоўскай сям'і, са старажытных часоў, спакон вякоў аселай у гэтым краі...»

У 1906 г. Раман Аляксандравіч абраны дэпутатам І Дзяржаўнай думы. Дэпутаты-краёўцы з літоўска-беларускіх губерній (Раман Скірмунт, Эдвард Роп, Аляксандр Лядніцкі, Геранім Друцкі-Любецкі, Пётр Масоніус і інш.) стварылі сваю групу — «тэрытарыяльнае кола», якая ўвайшла ў фракцыю «Саюз аўтанамістаў». Яны выступалі за аўтаномію тэрыторый, родныя мовы ў адукацыі і грамадскім жыцці, скасаванне нацыянальна-рэлігійных абмежаванняў.

У 1910 г. Раман Скірмунт быў абраны ў склад Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі (1910—1911 гг.). На працягу 1907—1917 гг. ён з'яўляўся намеснікам прэзідэнта Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (прэзідэнт — Эдвард Вайніловіч). Раман Аляксандравіч актыўна ўключыўся ў беларускі нацыянальны рух. Ён аказваў фінансавую падтрымку газеце «Наша ніва», БСГ. У студзені 1917 г. Раман Скірмунт узначаліў Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Як мецэнат, грамадскі дзеяч ён стаў шырока вядомы сярод насельніцтва. Вінцэнт Гадлеўскі пісаў, што «палітыцы ён быў аддаены целам і душою, не шкадаваў для яе ні фізічных, ні маральных трудоў» [5, с. 22].

12 сакавіка 1917 г. Р. Скірмунт правёў у Мінску Дзень нацыянальнага значка– ці не першую публічную акцыю за нацыянальнае самасцвярджэнне. «Минская газета» пісала 13 сакавіка: «На вуліцах горада прадаваліся значкі нацыянальных колераў Беларусі — чырвонага з белым. Упершыню забытая мова забытай беларускай вёскі дамініравала ўсюды: на вуліцах, у кавярнях, кінематографах. Цэнтральнай падзеяй стаў шматлюдны беларускі мітынг у кінатэатры «Гігант» пад старшынствам Рамана Скірмунта». «Кожны з нас, — гаварыў ён, — мужык або шляхціч, на зямлі Літвы ці Беларусі мае аднолькавае права з годнасцю звацца літоўцам, палякам, альбо беларусам. Кожнаму з нас належыць зямля пад нагамі, неба над галавой, вялікая мінуўшчына краю... Толькі краёвая ідэя, якая тут, на месцы, ёсць для нас цэнтрам цяжару і крыніцай дзейнасці, запальвае сэрцы здабываннем больш шчаслівай будучыні для гэтай роднай зямлі, якая трапіла ў асаблівую небяспеку».

На з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый 25—27 сакавіка 1917 г. Раман Аляксандравіч працаваў у 3 камісіях з 7. На другі дзень яму даручылі старшынстваваць на з'ездзе. У прынятай праграме было зафіксіравана патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі, рэформы школы з паступовым ўвядзеннем роднай мовы, адкрыццё ў Беларусі ўніверсітэта.

Раман Скірмунт быў абраны старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэта. На працягу 1917 г. ён займаў пасаду загадчыка аддзела Мінскага губернскага харчовага камітэта, прымаў удзел у Дзяржаўнай нарадзе ў Маскве ў жніўні, балатуецца ў дэпутаты Усерасійскага Устаноўчага сходу. У кастрычніку Скірмунт запрошаны для ўдзелу ў рабоце Часовага савета Расійскай рэспублікі (Перадпарламента).

Пасля разгону Усебеларускага з'езда Раман Скірмунт заставаўся сярод барацьбітоў за нацыянальнае адраджэнне. Ён увайшоў у склад Беларускай Народнай Рэспублікі, а потым узначаліў Урад БНР. Герб, сцяг, грашовыя знакі БНР былі ўведзены пры актыўным удзеле прэм'ер-міністра. 20 чэрвеня 1918 г. ён падаў у адстаўку.

Пасля Рыжскай мірнай дамовы і падзелу Беларусі Раман Скірмунт застаўся ў сваім маёнтку. У 1923—1928 гг. ён працаваў суддзёй Пінскага акружнога суда, быўсенатарам Польшчы (1930—1935 гг.). У верасні 1939 г. Раман Аляксандравіч у чарговы раз выказаў свае адносіны да роднай зямлі. Ён не пакінуў Беларуь. На вялікі жаль Раман Скірмунт разам з мужам сястры 7 кастрычніка 1939 г.быў забіты.

На наш погляд, такія імёны патрыётаў беларускай зямлі павінны заняць сваё пачэснае месца ў жыцці сучаснага пакалення.

### Бібліяграфічны спіс

1. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917—1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. — Мінск: БДУ, 2003. — 307 с.

2. Гигин, В. Могла ли состояться БССР в 1917 году? // Беларуская думка. —2009. — № 12. — С. 62—71.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. — Ф. 60. — Воп. 3. — Спр. 242.

4. Турук, Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. — М.: Гос. изд-во, 1921. — 151 с.

5. Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця ў Менску ў 1917—1918 гг. // Спадчына. — 1997. — № 5. — С. 18—39.

**Мірановіч Яўген**

*Універсітэт у Беластоку (Беласток, Польшча)*

## ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА МІРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ПАРЫЖЫ

Пераможцы ў Першай сусветнай вайне вызначалі новы міравы парадак на Парыжскай канферэнцыі, якая пачала працу ў студзені 1919 г. У выніку ваенных падзей у Еўропе распаліся тры вялікія імперыі. Народы, якія пражывалі ў іх межах, заявілі аб жаданні стварыць нацыянальныя дзяржавы. Гэты працэс закрануў і беларусаў. 25 сакавіка 1918 г. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) абвясціла незалежнасць, што было праявай волі нацыянальных эліт. На практыцы аднак дасягнуць незалежнасці і атрымаць міжнароднае прызнанне было вельмі складана.

Напрыканцы 1918 г. лідэрам новых дзяржаў Усходняй і Сярэдняй Еўропы стала вядома, што палітычную карту кантынента акрэсляць пераможцы ў Першай сусветнай вайне на мірнай канферэнцыі ў Парыжы. У Расіі ў гэты час ішла грамадзянская вайна. Былыя саюзнікі Імперыі Раманавых — Францыя, Велікабрытанія — чакалі перамогі антыбальшавіцкай апазіцыі, а таму ў пытанні пасляваеннага палітычнага парадку ва Усходняй Еўропе сур'ёзна разглядалі пункт гледжання цэнтраў улады, якія сфарміраваліся вакол генерала М. Дзянікіна і адмірала А. Калчака. Ніводны з іх не прызнаваў магчымасці існавання беларускай дзяржаўнасці. Бальшавіцкую ўладу лідэры Антанты лічылі часовай, а таму не запрашалі ўрад савецкай Расіі на Парыжскую канферэнцыю.

Найважнейшыя палітычныя ігракі — французы і англічане — рэалізуючы свае праекты палітычнага парадку ў Еўропе не прадугледжвалі існаванне бела-